Выпуск 19 / Лістапад 2022

Дасылайце, калі ласка, інфармацыю пра ўсё, што тычыцца адукацыі беларусаў, у наш бяспечны і ананімны чат-бот @eduOST_bot . Паведамляйце нам навіны са сваёй установы адукацыі ці дзяржаўнага ведамства датычна рэпрэсій і розных форм ціску з боку кіраўніцтва, пішыце нам пра факты карупцыі і новыя распараджэнні, якія здаюцца вам неабгрунтаванымі ці нерацыянальнымі. Таксама запрашаем вас дзяліцца сваімі ідэямі і прапановамі па рэфармаванні сістэмы адукацыі.

У нас з’явіўся сайт www.asvetaby.org, дзе можна знайсці ўсе выпускі дайджэсту “Асвета” на беларускай, рускай і англійскай мовах.

## РЭПРЭСІІ

Былую настаўніцу беларускай мовы, палітвязня Эму Сцепулёнак асудзілі на 2 гады калоніі. Суддзя Ірына Яскевіч Міёрскага раённага суда палічыла яе вінаватай у парушэнні арт. 368 (абраза прэзідэнта) і арт. 369 (абраза прадстаўніка ўлады). Сцепулёнак была ўзятая пад варту ў зале суда. Вядома, што асуджаная мае некалькі хранічных захворванняў, якія абвастрыліся падчас яе знаходжання пад вартай. У сувязі са знаходжаннем пад арыштам да суда на працягу года, пазбаўленне волі Сцепулёнак пасля вынясення прысуду працягнецца каля 4 месяцаў.

21 лістапада падчас заняткаў быў затрыманы навучэнец Беларускага дзяржаўнага медыцынскага каледжа Максім Гуйдо. Вядома, што раней ён працаваў у міліцыі, адкуль звольніўся ў 2020 годзе.

Затрыманы сузаснавальнік навукова-адукацыйнага праекта “Разумны Мінск” Сяргей Саўкін. Паводле інфармацыі ў відэа, апублікаваным у праўладным Тэлеграм-канале, Саўкіна абвінавачваюць у тым, што ў сцэнары навагодняй праграмы “Разумнага Мінска” для дзяцей прысутнічае фраза “Стары Дзед Мароз стаміўся, таму прыйшоў час выбіраць новага”. Таксама ў відэа Саўкін сцвярджае, што ён удзельнічаў у акцыях пратэсту, блакаваў рух транспарту, быў падпісаны на Тэлеграм-каналы, прызнаныя ўладамі “экстрэмісцкімі”.

Дзве настаўніцы сельскіх школ Гомельскай вобласці (меркавана — Буда-Кашалёўскага раёна) былі затрыманыя і аштрафаваныя за падпіску на інфармацыйныя рэсурсы, прызнаныя ўладамі “экстрэмісцкімі”. Відэазапіс з імі з’явіўся ў адным з гомельскіх праўладных Тэлеграм-каналаў.

Праваабарончая арганізацыя “Вясна” апублікавала гісторыі дзяцей, якія былі асуджаныя за ўдзел у пратэстах ці антываеннай дзейнасці на турэмныя тэрміны яшчэ непаўналетнімі. Публікацыя расказвае пра тое, як да іх ужывалі фізічны гвалт, як іх судзілі, і як цяпер яны адбываюць пакаранне.

23 лістапада Магілёўскі абласны суд паўторна разгледзеў справу 20-гадовай студэнткі Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта ім. А. Куляшова, палітвязня Дануты Перадні, паколькі Кіраўскі раённы суд, які раней вынес дзяўчыне прысуд, не меў права разглядаць гэтую справу. У выніку новага разгляду быў вынесены такі ж прысуд: 6,5 гадоў калоніі агульнага рэжыму за рэпост публікацыі, у якой асуджаліся дзеянні Пуціна і Лукашэнкі па развязванні вайны супраць Украіны.

## ПАЛІТЫКА РЭЖЫМУ

Аляксандр Лукашэнка даручыў міністру ўнутраных спраў Івану Кубракову адкрыць ліцэі МУС ва ўсіх абласцях Беларусі (цяпер дзейнічае толькі адзін у Мінску), якія стануць падрыхтоўчым этапам фарміравання кадраў для міліцыі.

Міністэрства адукацыі прапануе ўвесці абавязковую фармальную характарыстыку вучня пасля заканчэння школы, якая будзе ўключаць звесткі пра яго ўдзел у грамадскім жыцці і будзе мець значэнне пры яго паступленні ў ВНУ.

Па ініцыятыве кіраўніка Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў, эксміністра ўнутраных спраў Ігара Шуневіча, на грамадскае абмеркаванне вынесены праект указа Лукашэнкі, які прадугледжвае прыняцце ў Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў дзяцей, пачынаючы з 8-гадовага ўзросту.

Тэлеграм-канал Вольны БДУ заявіў пра тое, што ў БДУ пачаліся масавыя звальненні нелаяльных выкладчыкаў праз непрацягненне кантракта. Згодна з атрыманымі звесткамі, плануецца скараціць штат кожнага факультэта на 10–12 працоўных ставак.

Прапагандыст Ігар Тур стаў выкладчыкам па сумяшчальніцтве на кафедры тэлебачання і радыёвяшчання журфака БДУ. Ён вядзе факультатыў “Рэпарцёр тэлебачання” для студэнтаў 2-га курса.

У снежні Нацыянальная акадэмія навук Беларусі ў супрацоўніцтве з расійскімі партнёрамі правядзе два ідэалагічныя мерапрыемствы на тэму агульнай гісто-

рыі Беларусі і Расіі: навукова-асветніцкі фестываль “Адзінства народаў Беларусі і Расіі: шматвяковая гісторыя” і экспертна-асветніцкі форум “Яднанне народаў Беларусі і Расіі: ад агульнага мінулага да агульнай будучыні”.

16–17 лістапада ў Мінску адбыўся беларуска-расійскі форум  “Моладзь і выбары”. Арганізатарамі форума выступілі ЦВК Беларусі і Міністэрства адукацыі Беларусі. Цэнтральным мерапрыемствам форуму стала сустрэча моладзі са старшынём ЦВК Беларусі Ігарам Карпенкам і старшынёй ЦВК Расіі Элай Памфілавай.

Сталічная гімназія №50 аб’явіла конкурс для навучэнцаў 2–5 класаў пад назвай “Крамлёўская ялінка”. Сярод конкурсных заданняў: малюнак на тэму “Беларускія школьнікі на Крамлёўскай ялінцы” і сачыненне на тэму “Навагоднія прыгоды беларусаў у Маскве”. Прызёры наведаюць навагоднюю ўрачыстасць у Крамлі. Спонсарам паездкі стане пасольства РФ у Беларусі.

Навучэнцаў сярэдняй школы №2 г.Ельска звадзілі на экскурсію ў папраўчую калонію №20 у Мазырскім раёне “з мэтай прафілактыкі ўчынення непаўналетнімі злачынстваў і правапарушэнняў”.

Адміністрацыя дзіцячага сада №5 г. Лельчыцы арганізавала выступленне дзяцей для намесніка пракурора Лельчыцкага раёна ў межах “выхаваўча-патрыятычнага” мерапрыемства. Для госці дзеці выканалі дзяржаўны гімн РБ.

Для навучэнцаў 2-3 класаў Урэцкай сярэдняй школы №2 Любанскага раёна Мінскай вобласці былі праведзены заняткі, на якіх ваенрук прадэманстраваў дзецям баявую зброю і для азнаямлення прадставіў інфармацыйныя матэрыялы “Зброя перамогі” і “Генацыд беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны”. У гэтай жа школе функцыянуе раённы рэсурсны цэнтр дапрызыўнай падрыхтоўкі, які наведваюць малодшыя школьнікі ў якасці экскурсій. Таксама пасля заняткаў у гэтым цэнтры, па ўказанні ваенрука, два сямікласнікі Урэцкай СШ №2 наведалі Урэцкі дзіцячы садок №35 і прадэманстравалі зброю пяцігадовым дзецям.

## ГРАМАДЗЯНСКАЯ СУПОЛЬНАСЦЬ І АДУКАЦЫЯ

4 снежня на пляцоўцы “Беларускага Міждысцыплінарнага семінара” адбудзецца адукацыйны анлайн-семінар на беларускай мове на тэму “Працоўная

камунікацыя па-англійску: важныя моманты, парады, культурныя асаблівасці". Для ўдзелу неабходна запоўніць заяўку. "Беларускі Міждысцыплінарны семінар" — свабодная пляцоўка для прэзентацыі і абмеркавання навуковых даследаванняў беларусаў з мэтай развіцця міждысцыплінарных сувязяў у беларускай навуцы і кансалідацыі беларускай акадэмічнай супольнасці.

Прадстаўніца Святланы Ціханоўскай па пытаннях адукацыі і навукі Таццяна Шчытцова пракаментавала з'яўленне ў школьных атэстатах графы для ацэнкі за паводзіны: "рэжыму неабходна, каб на выхадзе, пасля навучання ў школе, у нас былі грамадзяне, галоўнай дабрадзейнасцю якіх з›яўляецца лаяльнасць у адносінах да аўтарытэту, улады".

## МІЖНАРОДНЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

28-29 красавіка адбудуцца штогадовыя Лонданскія чытанні па беларускіх даследаваннях. Запрашаюцца даследчыкі ў вобласці гісторыі, палітычных навук, эканомікі, літаратуры, сацыялогіі і рэлігіі для прэзентацыі вынікаў сваіх даследаванняў; вітаюцца міждысцыплінарныя даследаванні. Вылучаныя працы будуць апублікаваныя ў "Журнале беларускіх даследаванняў". Мерапрыемства пройдзе ў гібрыдным фармаце. Працоўная мова — англійская. Прыём заявак — да 15 студзеня 2023 г.

Дзяржддэпартамент ЗША запрашае беларускіх студэнтаў апошняга курса ва ўзросце ад 18 да 25 гадоў да ўдзелу ў летняй праграме студэнцкага абмену "Даследаванне інстытутаў ЗША для студэнцкіх лідараў з Еўропы" (SUSI) па тэме "Грамадзянская ўцягнутасць". Для ўдзелу ў праграме неабходна веданне англійскай мовы. Апошні тэрмін падачы заявак — 1 студзеня 2023 г.

Дзяржддэпартамент ЗША запрашае маладых IT-прадпрымальнікаў да ўдзелу ў 5-месяцовай стажыроўцы ў амерыканскіх арганізацыях, звязаных з інавацыямі. Для ўдзелу ў праграме неабходна мець грамадзянства РБ, адпавядаць узроставаму крытэрыю (25–35 гадоў), валодаць англійскай мовай, быць занятым у інфраструктуры падтрымкі інавацый і прадпрымальніцтва. Апошні тэрмін падачы заяўкі — 31 студзеня 2023 г.

Еўрапейскі каледж запрашае на навучанне па магістарскай праграме ў Бругге (Бельгія) або Варшаву (Польшча) па такіх спецыяльнасцях як: еўрапейскія

эканамічныя даследаванні, еўрапейскае заканадаўства, еўрапейская палітыка і кіраванне, міжнародныя адносіны Еўрапейскага саюза, дыпламатыя і інш. Навучанне платнае, для суіскальнікаў з Беларусі прадугледжаны стыпендыі, якія пакрываюць расходы на навучанне, пражыванне і дарогу. Апошні тэрмін падачы заявак на навучанне — 18 студзеня 2023 г.

Дзярждэпартамент ЗША прапануе беларускім студэнтам, якія вучацца ў ВНУ Беларусі, стаць удзельнікам “Глабальнай праграмы студэнцкага абмену” (Global UGRAD) і пачаць навучанне ў ЗША. Для ўдзелу ў праграме неабходна веданне англійскай мовы. Больш падрабязна аб крытэрах адбору ўдзельнікаў — на сайце арганізатара. Апошні тэрмін падачы заяўкі для ўдзелу ў праграме — 15 снежня 2022 г.

Енскі каледж ім. Імрэ Кертэса запрашае суіскальнікаў на стажыроўку для правядзення самастойнага даследавання ў сферы гісторыі, сацыялогіі, антрапалогіі, паліталогіі, філасофіі, літаратуры, лінгвістыкі — па тэме, якая тычыцца Цэнтральнай або Усходняй Еўропы. Працягласць стажыроўкі — ад 3 да 12 месяцаў. Адно з патрабаванняў да суіскальнікаў — наяўнасць ступені кандыдата навук. Арганізатары забяспечваюць удзельнікаў праграмы штомесячнай стыпендыяй, а таксама месцам для працы над даследаваннем і падтрымкай ва ўладкаванні ў Ене. Апошні тэрмін падачы заяўкі на ўдзел у стажыроўцы ў 2023 г. — 31 снежня 2022 г., на ўдзел у стажыроўцы ў 2023–2024 гг. — 30 красавіка 2023 г.

Цэнтр расійскіх, усходнееўрапейскіх і еўразійскіх даследаванняў (CREEES) Стэнфардскага Універсітэта запрашае даследчыкаў у сферы гісторыі і актуальных праблем усходнееўрапейскага рэгіёна да ўдзелу ў стажыроўцы імя Уэйна Вучыніча. Удзел прадугледжвае правядзенне або працяг уласнага даследавання ў Цэнтры на працягу 12 тыдняў з выкарыстаннем яго бібліятэкі і працоўнай прасторы, удзел у мерапрыемствах Цэнтра, выкладанне ў Цэнтры (1 лекцыя і 1семінар). Адабраным удзельнікам будзе аказана фінансавая падтрымка ў памеры 15000 долараў ЗША, падтрымка ў атрыманні візы, будуць кампенсаваны выдаткі на дарогу і медыцынскую страхоўку. Для ўдзелу ў праграме неабходна мець ступень кандыдата навук, атрыманую цягам апошніх 5 гадоў. Апошні тэрмін падачы заявак — 15 студзеня 2023 г.

Мюнхенскі ўніверсітэт Людвіга-Максіміліяна запрашае суіскальнікаў на ўдзел у правядзенні 4-гадовага дактаранцкага групавога даследавання на тэму фарміравання вобраза сям›і ў літаратуры і СМІ ад старажытнасці да сучаснасці. Рабочыя мовы: англійская і нямецкая. Патрабаванні да кандыдатаў: наяўнасць

ступені магістра, праект дысертацыі ў межах тэмы даследавання. Апошні тэрмін падачы заяўкі — 7 студзеня 2023 г.

Берлінская асацыяцыя “Акадэмічная сетка Усходняй Еўропы” (Akademisches Netzwerk Osteuropa) у межах праграмы “Навука ў небяспецы” (Science at risk) прапануе кансультацыйна-арганізацыйную дапамогу беларускім даследчыкам і навукоўцам, якія пацярпелі ад рэпрэсій і вайны, якая ўключае два напрамкі: экстраны пошук праграм падтрымкі для працягу даследчай, выкладчыцкай дзейнасці або навучання і прапанова правядзення лекцый і заняткаў за ўзнагароджанне.

Фонд “Дом навук пра чалавека“ і Цэнтр франка-расійскіх даследаванняў абвясцілі конкурс заявак для навукоўцаў на атрыманне стыпендыі тэрмінам ад 2 да 3 месяцаў для правядзення даследаванняў у сферы гуманітарных і сацыяльных навук. Памер стыпендыі складае 1600 эўра на месяц. Таксама абраным удзельнікам арганізатары абяцаюць аказаць візавую падтрымку, а таксама прадставіць рэкамендацыйныя лісты для працы ў бібліятэках і архівах. Для ўдзелу ў конкурсе неабходна мець ступень кандыдата навук і папярэднюю дамоўленасць з адной з акадэмічных устаноў Францыі пра тое, што яна выступіць у ролі прымаючага боку на перыяд правядзення даследавання. Апошні тэрмін падачы заявак — 9 снежня 2022 г.

Для беларускіх вучоных са ступенню магістра, кандыдата або доктара навук адкрыта магчымасць атрымання стыпендыі ўрада Швейцарыі тэрмінам на 1 год, якая складзе ад 1920 да 3500 швейцарскіх франкаў на месяц у залежнасці ад віду праграмы. Пачатак праграмы — 1 верасня 2023 года. Апошні тэрмін падачы заявак — 9 снежня 2022 г.